# Марыў аднавіць зямлю, спустошаную вайной

**...Над чыгуначным перагонам раскшулася цёплая летняя ноч. На небе мякка зіхацелі жнівеньскія зоры, ляніва пераклікалася нямецкая ахова. Каля палатна, нібы здань, узнік малады чалавек. Незауважаны нікім, здаецца, на хвіліну прысеў каля самых рэек, затым падняўся і хутка накіраваўся ў лес. 3 паугадзіны пасля пачууся грукат калёс: з-за схаванага хмызняком і маладымі дрэўцамш паварота вынырнуў цягнік. Калі ён трапіў на месца, дзе спыняўся незнаёмец, грымнуў моцны выбух. Паравоз, быццам жывы, устаў на дыбы, вагоны паляцелі пад адхон, платформы з ваеннай тэхнікай склаліся як папяровыя і ахінуліся агнём. Над перапалоханым полем расцвіло чырвона-рудае зарава пажару... Той ноччу 19 жшуня 1942 года будучы Герой Савецкага Саюза, вядомы вучоны у сферы глебазнауства Фёдар МАЛЫШАЎ падарвау першы са сваіх 19 варожых эшалонаў.**

Фёдар Аляксеевіч МАЛЫШАЎ нарадзіуся 20 красавіка 1914 года у вёсцы Заполле (Петрыкаусю раён) у шматдзетнай сям’і. Калі яму споўнілася 4 гады, бацькоў не стала. Хлопчык выхоўваўся у дзядзькі. У 1929 годзе ён пастутпіу сельскагаспадарчую школу, у 1933-1935 вучыўся на рабфаку. У 1941 годзе скончыў торфамеліярацыйны факультет Беларускага палітэхнічнага інстытута і быў накіраваны у Віцебскш раён на торфапрадпрыемства «20 гадоў Кастрычніка». Аднак неўзабаве пачалася Вялікая Айчынная вайна.

У першыя яе дні прадпрыемства працягвала працу. А калі узнікла пагроза яго захопу, па загадзе Кіраўніцтва Малышаў з групай рабочых знішчыў заводскае абсталяванне. Але знайшліся здраднікі, якія выдалі патрыётаў. Фёдара арыштавалі як сабатажніка і адправілі ў канцэнтрацыйны лагер, адкуль ён разам з некалыймі вязнямі здолеў збегчы.

Жаданне адпомсщць ворагам і вярнуць шчасце роднай зямлі вызначыла яго далейшы лёс: Фёдар, як і чацвёра яго братоў, далучыуся да народных мсціўцаў 125-й брыгады Палескага партызанскага злучэння. Малады інжынер трапіў у дыверсійную групу кадравага афіцэра Чырвонай армій, будучага Героя Савецкага Саюза Рыгора Такуева.

Лёсавызначальнай ноччу 19 жніўня 1942 года Фёдар Малышау выйшаў на падрыу чыгункі разам з трыма таварышчамі Менавіта яму было даручана замініраваць рэйкі - першае выпрабаванне спрытнасці, настойлівасці, мужнасці. Успаміны аб гэтым будучы вучоны пранясе праз усё жыццё: «Прапусцілі лёгка пагрукваючы па стыках рэек таварны паражняк. Калі здалёку паказауся неабходны нам эшалон, я хутка падпоўз да чыгункі, паклаў на рэйку міну і разам з групай ледзь паспеў адыйсці. Хутка раздауся страшэнны выбух, грукат і трэск, перапалоханыя крык! і стогны. Першае баявое задание было выканана». Партизанская разведка потым устанавіла, што цягнік вёз карны атрад. Было забіта больш за 200 эсэсаўцаў, знішчаны паравоз і шмат ваеннай тэхнікі.

### Камандзір мінёраў

Пасля некалькіх пасняхова праведзеных дыверсій Малышаў стаў камандзірам групы падрыўнікоў. Дзейнічалі вельмі зладжана і чыста - пасля іх «работы» да станцый прызначэння не даязджаў ні водны варожы эшалон. Ляцелі пад адхон цягнікі з фашыстскімі афіцэрамі і салдатамі, танкамі, пушкамі і іншай тэхнікай.

У хуткім часе Фёдар пачаў выпрацоўваць свае метады «абслугоўвання» фашысцкага транспарту. Ён праектаваў і асабіста выpабляў адмысловыя выбуховыя прылады, якія гітлераўцы не маглі выявіць металашукальнікамі. Партизаны ставил іх уначы, а у дзённы час узрывалі Пры адсутнасцш толу або дэтануючых капсул на рэйкі надкладваліся спецыяльныя стальныя кліны, вырабленыя ў партызанскай кузні. Колы паравозаў на хаду перамяшчаліся на гэтыя «стрэлкі»:

калі эшалон ішоў на вялікай хуткасці, увесь састаў ляцеў пад адхон. Пераймаць вопыт Федзі-Падрыўніка прыходзилі партызаны з другіх атрадаў. Пасля некалькіх аварый на «стрэлках» фашысцкія цягнікі сталі хадзщь павольна, амаль навобмацак. Вядома, такія меры дрэнна адбываліся на варожых пастаўках для фронту.

Раз’юшаныя гітлераўцы пачалі размяшчаць на кожным кіламетры чыгункі па 20-25 салдат. Учыняць дыверсіі стала значна складаней: падрыўнікі нярэдка траплялі на засады, аказваліся у акружэнні Фёдар страціў брата Сяргея, хутка памёр ад ран і Сцяпан. Тады партызаны прыдумалі новую тактыку: знішчаць чыгуначную ахову і спакойна мініраваць пуці.

Вясной 1943 года дзякуючы падрыўнікам Малышава быў паралізаваны рух эшалонаў, што пастаўлялі нямецкіх салдат і баявую тэхніку на Курскую дугу. Па заданні камандзіра брыгады трэба было сапсаваць даволі вялікі кавалак чыгункі, але ўзрыўчаткі не хапала. Тады Фёдар прапанаваў адрываць ад шпал кастылі.

...У ноч аперацыі дзьмуў пранізлівы вецер, які з сілай шпурляў у твар мокрае снежнае крошыва. Падрыўнікі ў маскхалатах белымі ценямі падышлі да чыгуначнага палатна і ўзяліся раскручваць балты на стыках, аднак тыя заледзянелі і не паддаваліся. З вялікай асцярожнасцю, каб не заўважыла ахова, партизаны перабраліся ў іншае месца і паспрабавалі яшчэ раз... Нарэшце, амаль перад самым цягнікам, рэйка была зрушана. Малышаўцы кінуліся у лес...

Эшалон на вялікай хуткасці сышоў з каляіны. Вагоны з салдатамі, цыстэрны з гаручым, платформы са зброяй і танкамі - «фердынандамі» і «тыграмі», на дапамогу якіх так спадзяваліся фашысты, сутыкаліся, навальваліся адзін на аднаго. Усё было ахоплена агнём, зямлю скалыналі моцныя выбухі Чыгуначная ахова распачала пальбу па прыдарожным гушчары, аднак падрыўнікі былі ужо далёка...

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 жніўня 1944 года за «узорнае выкананне заданняў камандавання ў барацьбе супраць нямецкіх захопнікаў у тыле працшўніка і праяўленыя пры гэтым адвагу і геройства» Фёдар Малышаў быў удастоены высокага звания Героя Савецкага Саюза. Ва узнагародным лісце, падпісаным начальнікам штаба партызанскага руху Беларусі Пятром Калініым, адзначалася: «На асабістым рахунку т. Малышава маецца 19 воінскіх эшалонаў праціўніка, спушчаных пад адхон, у вышку чаго знішчана 16 паравозаў і 191 вагон, сярод ніх 42 цыстэрны з гаручым, 46 вагонау з жывой сілай, 56 з харчаваннем, 28 з боепрыпасам! і 19 з будаунічымі матэрыяламі».

### Вучоны

Каб ачысціць радзіму ад гітлераўцаў, Фёдар Малышаў быў вымушаны ўзрываць родную зямлю, якую марыў пакрыць квітнеючымі садамі. Але ён верыў, што надыдзе час, калі зможа прыкласці ўсе сілы, каб залячыць яе раны. А пра торф, па ўспамінах баявых таварышчаў, мог расказваць гадзінамі: «Торф - гэта такое багацце у нашай зямельцы, што і ўявіць цяжка!» Дарэчы, і ў вольныя ад баявых дзеянняў дні з вялікай ахвотай блукаў па тарфяніках, абдумваючы іх будучае засваенне. Усім сэрцам чакаў заканчэння вайны, каб нарэшце заняцца навукай.

Яго мара здзейснілася. Пасля вайны Фёдар Аляксеевіч прысвяціў жыццё аднауленню зямлі і яе ўзбагачэнню. Ён застаўся верным зацікаўленасці торфам і стаў вядомым спецыялістам у галіне торфараспрацоукі і меліярацыі глебы. Акадэмікі І. Лупіновіч, Ф. Апека і іншыя высока ацаніў яго распрацоукі і адкрыцці. Малышаў паспяхова закончыў аспірантуру, абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыю. Працаваў у Наркамаце паліўнай прамысловасці БССР, а потым у 1947-1990 - у інстытуце торфу Акадэміі навук БССР, дзе заведваў лабараторыяй комплекснага выкарыстання тарфяных радовішчаў Палесся.

Значную частку навукова-даследчыцкай дзейнасцш праводзіў на тарфяной вопытнай станцыі у Дукорах. Паспяховы вопыт адразу разыходзіўся па сельскіх гаспадарках не толькі у Беларусі, але і за яе межамі. Навуковая спадчына Малышава - больш за 120 артыкулаў, манаграфіі, аўтарскія пасведчанні на вынаходніцтвы, кніг: «Здабыча і прымяненне торфу на угнаенне і подсцілку», «Гидромеханизация добычи торфа для удобрения», «Освоение

площадей выработанных торфяных месторождений» і інш. Працы прысвечаны пытанням павышэння урадлівасці глебы пры дапамозе насычэння яе часцінкамі торфу, праблеме выкарыстання выпрацаваных тарфяных радовішч.

На жаль, дваццаць гадоў таму, 1 мая 2005 года, Фёдара Аляксеевіча не стала. Але памяць аб ім працягвае жыць. У гонар героя у Мінску установлена мемарыяльная дошка на фасадзе дома, дзе ён жыў, яго імем названа сярэдняя школа № 48, а ў школе вёскі Камаровічы арганізаваны пакой баявой славы.

Даўно аднавікася зямля Палесся. На былых багнах красуюцца пышныя лугі і багатыя нівы. Шумяць партызанскія лясы, быццам пераказваюць ветру паданні самага таямнічага краю Беларусі. Сярод тых легенд гучыць і аповед пра жыццё героя партызанскай вайны, вучонага Фёдара,Аляксеевіча Малышава.

**Вольга САБАЛЕЎСКАЯ**